**АГОНЬ**
Ахоўвае ад Нядобрых Духаў.
Выкарыстоўваецца ў час абрадаў і магічных дзеянняў

## III. *“СВЯТА РАЎНАДЗЕНСТВА”*
13.15 – 13.35

| **Музычнае суправаджэнне:** | **Абрадавыя гульні і традыцыйныя танцы:** |
| --- | --- |
| ***“Мілавіца”*** *(М.Сітко)* | *“Лявоніха”*<br>*“Кракавяк”*<br>*“Падэспан”*<br>*“Нарэчанька”*<br>*“Ва садулі”*<br>*“Полька з дзеркачом”*<br>*“Полька-расцяпа”*<br>*“Проса” (гульня)*<br>*“У карагодзе мы былі” (карагод-гульня)* |
| ***“Вянок”*** *(А. Пятроўская)* | *“Акуліна”*<br>*“Страданія”*<br>*“Падэспан”*<br>*“У гарочку” (гульня)* |
| ***“Раме”*** *(В Калацэй)* | *“Верабей”*<br>*“Ойра літоўская”*<br>*“Базар”* |
| ***“Этна-Суполка”*** *(Т.Шадунова)* | *“Падэспан”*<br>*“Юрачка”*<br>*“Картузэ”*<br>*“Кракавяк”*<br>*“Какетка”*<br>*“Грушка” (карагод-гульня)*<br>*“У карагодзе мы былі” (карагод-гульня)*<br>*“Явар”* |

**Этнаграфічныя звесткі**

*П.В.Шэйн:* “У Гомельскім павеце дзяўчаты збіраліся гуртам і ішлі на узвышаныя месцы, звычайна каля гумнаў, падсцілалі салому і, пасеўшы на яе, спявалі да позняй ночы веснавыя песні. Гэтыя песні разносіліся па наваколлю і былі чуваць на суседніх “зборных пунктах”. Часам спявалі на чарзе: у адным месцы пачнуць і спыняцца, у другім працягваюць. Хлопцы ж з дудкамі і гармонікамі пераходзілі ад адной групы да другой”.

**ЗЯМЛЯ**
Прастора і месца існавання людзей і ніжэйшых (зямных) багоў

## *Слоўнічак*
*удзельніка абрадавага свята:*

**Абрад** - сукупнасць рытуальных дзеянняў, якія ілюстроўваюць рэлігійныя ўяўленні ці бытавыя традыцыі

**Абрадавае свята** - масавае культурнае мерапрыемства з духоўна-магічным дзеяннем, якое праводзіцца эстэтычнымі сродкамі святочнай культуры (песня, танец, карагод, музыка, карнавалізацыя, атрыбутыка). Прымеркавана да асаблівых перыядаў жыцця чалавека, звязана з момантамі узвышанага ўрачыстага стану яго душы

**Бог** - вышэйшая звышнатуральная істота, надзеленая вышэйшым розумам, дасканаласцю, якая кіруе светам (у розных абліччах – Ярыла, Вялес...)

**Вырай** - прастора ў Небе, куды адлятаюць на зіму птушкі і душы памерлых людзей

**Вяснянка - (веснавая загукальная песня)** “самастойная” песня-абрад, якая заўсёды мела магічнае прызначэнне. Яе выкананне не суправаджалася ніякімі абрадавымі дзеяннямі. Вяснянкі самі фарміруюць абрадавыя дзеянні.

**Загуканне** - веснавое *свята* і старажытны рэлігійны *абрад*. Рытуальныя дзеянні і песні абраду накіраваны на тое, каб наклікаць і паскорыць вяртанне цёплага, сонечнага і ўрадлівага перыяду года – *Вясны*. Кожны беларус з Ёю звязвае свае надзеі на багаты ўраджай, дабрабыт і шчасце

**Марэна** - смяротны дух, які пануе над зямлёй і людзьмі. Калі прыходзіць час вясны – вымушана хавацца ў Наўі

**Птушкі** - персанажы архаічных міфаў, з'яўляюцца вешчымі. Міфічныя істоты, якія з'яўляюцца паведачамі Бога (сарока, воран, жаваронак, бусел)

**Рытуал** - (лац. ritualis – абрадавы) – стэрэатыпныя і паўтаральныя дзеянні ў рэлігійных, побытавых ці гаспадарчых абрадах, святах

**Ярыла - (Юр'я – хрысціянскі святы)** Бог у сваім веснавам абліччы, апякун урадлівасці і кахання. З яго жыццём звязаны пачатак сапраўднай *Вясны* (ст.славянс.“Яр”– Вясна, “яравы” - веснавы)

Цэнтральны дзіцячы парк імя М.Горкага

***Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў***

**Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Вікторыя» г.Мінска**

Педагогі (кіраўнікі фальклорных калектываў), дзеці і моладзь г.Мінска і Мінскай вобласці

кампанія «Будзьма беларусамі»

# А б р а д а в а е   с в я т а
# ГУКАННЕ ВЯСНЫ



***Памажы, Маці, нам Вясну гукаці!***
***Божа, дай, Божа, дай, Божа, памажы!***

***Дата правядзення:*** 4 красавіка
***Час правядзення:*** 12.00 – 14.35
***Месца правядзення:*** Цэнтральны дзіцячы парк г.Мінска

Мінск 2013